Даследчык С. В. Мартынкевіч падкрэслівае, што прынцып узаемасувязі развіцця вуснага і пісьмовага маўлення «патрабуе ад настаўніка выкарыстання формаў працы, накіраваных як на развіццё вуснага, так і на развіццё пісьмовага маўлення. Улічваючы, што часта на ўроках беларускай мовы пісьмовая форма маўлення пераважае, настаўнік, кіруючыся названым прынцыпам, павінен суадносіць прыёмы працы пры фарміраванні ў вучняў ўменняў вуснай і пісьмовай камунікацыі» [1, с. 8].

Прынцып сувязі работы па развіцці маўлення з вывучэннем усіх раздзелаў школьнага курса мовы і літаратуры арыентуе настаўніка на выкарыстанне форм працы па развіцці маўлення як пры вывучэнні ўсіх раздзелаў курса беларускай мовы, так і пры вывучэнні літаратуры. Так, Т. А. Ладыжынская ўсе заданні па развіцці маўлення ўмоўна падзяляе на пяць груп:

1) заданні аналітычнага характару па гатовым тэксце;
2) заданні аналітыка-сінтэтычнага характару па гатовым тэксце (аналіз гатовага тэксту і стварэнне на гэтай аснове элементаў тэксту);
3) заданні на перапрацоўку гатовага тэксту (удасканаленне тэксту);
4) заданні на стварэнне новага тэксту на аснове прапанаванага;
5) заданні на стварэнне ўласнага тэксту.

Асноўнымі прыёмамі працы па развіцці маўлення ў методыцы выкладання мовы з'яўляюцца: чытанне тэкстаў розных стыляў і жанраў; сэнсава-граматычны, стылістычны, структурна-кампазіцыйны аналіз тэксту; фармулёўка пытанняў да тэксту; рэцэнзаванне вуснага адказу вучня; рэдагаванне тэксту; складанне кампазіцыйнай схемы тэксту; структураванне тэкстаў у адпаведнасці з тэматыкай і інш.

Як адзначае Г. М. Валочка, «немагчыма вылучыць універсальныя камунікатыўныя ўменні, якія б забяспечвалі стварэнне тэкстаў усіх стыляў, тыпыў і жанраў. Кожнае канкрэтнае ўменне непасрэдна звязана з відам выказвання. Таму лічыцца, што вучыць школьнікаў трэба не ўменням наогул, а канкрэтным уменням, якія залежаць ад стылю, тыпу і жанру выказвання» [5, с. 108].

У сваю чаргу М. Г. Яленскі лічыць, што «настаўнік, вызначаючы сістэму працы па развіцці маўлення, павінен памятаць, што вучань ніколі не навучыцца выказваць свае думкі, уступаць у суразмоўніцтва, пакуль не будзе пастаўлены перад неабходнасцю дзейнічаць (гаварыць) ва ўмовах штучнага маўленчага асяроддзя — у працэсе школьнага навучання» [6, с. 52].

**Заключэнне.** На думку даследчыкаў і метадыстаў, арганізацыя працы па развіцці маўлення вучняў павінна ажыццяўляцца на аснове агульнадыдактычных, прыватнаметадычных і спецыфічных прынцыпаў. Кіруючыся імі, настаўнік выбірае метады і сродкі навучання школьнікаў.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. *Мартынкевіч, С. В.* Маўленчая дзейнасць як аснова фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў / С. В. Мартынкевіч // Сучасная моўная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: праблемы, перспектывы : матэрыялы рэсп. нав.-практ. канф. (да 80-годдзя праф. В. У. Протчанкі), Мінск, 9 крас. 2010 г. — Мінск : РІВШ, 2010. — С. 56—60.
2. Развитие русской речи учащихся средних и старших классов / М. Б. Успенский [и др.] ; под ред. Н. М. Шанского, И. Г. Чистяковой. — Л. : Просвещение : Ленингр. отд-е, 1998. — 225 с.
3. *Ляшчынская, В. А.* Методыка выкладання беларускай мовы : вучэб. дапам. / В. А. Ляшчынская, З. У Шведава. — Мінск : РІВШ, 2007. — 252 с.
4. *Колас, Я.* Методыка роднае мовы : зб. тв. : у 12 т. / Я. Колас. — Мінск, 1976. — Т. 12. — 319 с.
5. *Валочка, Г. М.* Тэарэтыка-метадычныя асновы развіцця звязнага маўлення вучняў на ўроках беларускай мовы: 5—10 клас / Г. М. Валочка. — Мінск : НІА, 2005. — 204 с.
6. *Яленскі, М. Г.* Асобасны падыход у методыцы навучання беларускай мове: тэарэтыка-эксперыментальнае даследаванне / М. Г. Яленскі. — Мінск : НІА, 1997. — 171 с.



УДК 821.161.3:82–3



**В. М. Ярмоліч**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*


## ФОРМЫ АЎТАРСКАЙ ПРЫСУТНАСЦІ Ў АПАВЯДАННІ ВЕНАНЦЫ БУТРЫМА «ХАТА»

**Уводзіны.** Праблема аўтара і яго прысутнасці ў творы з'яўляецца прадметам навуковых дыскусій. Адны даследчыкі яе адмаўляюць, другія прызнаюць. Так, Р. Барт і яго паслядоўнікі лічаць, што аўтар знаходзіцца ў мінулым адносна сваёй кнігі. Але большасць даследчыкаў лічаць, што твор нельга разглядаць асобна ад яго стваральніка. Мы таксама кіруемся гэтай думкай. Існуе вялікая колькасць тэрмінаў для абазначэння прысутнасці аўтара ў мастацкім творы. Адзін з іх — аўтарская свядомасць. Гэта «выяўленне аўтарскага светапогляду як сістэмы абагульненых поглядаў чалавека на аб'ектыўны


© Ярмоліч В. М., 2017





Репозиторий БарГУ

свет і яго месца ў ім, а таксама абумоўленыя гэтымі поглядамі яго асноўныя жыццёвыя пазіцыі, перакананні, каштоўнасныя арыентацыі» [3, с. 52].

**Асноўная частка.** Аўтарская свядомасць выяўляецца рознымі сродкамі: моўнымі, графічнымі, кампазіцыйнымі. Формай прысутнасці аўтара ў тэксце з’яўляюцца назва твора, гаваркія прозвішчы, тапанімічныя назвы, у якіх аўтар непасрэдна звяртаецца да чытачоў, аўтарскія лірычныя адступленні і інш. Адной з усталяваных каштоўнасцей беларускага быцця з’яўляецца хата. Такую назву носіць апавяданне Венанцы Бутрыма, якое мае выразныя рысы эсэ. Эсэ —жанр філасофскай, літаратурна-крытычнай, гісторыка-біяграфічнай, публіцыстычнай прозы, які спалучае падкрэслена індывідуальную пазіцыю аўтара з нязмушаным, часта парадаксальным выкладам, арыентаваным на гутарковае маўленне [4]. Сучасны даследчык Міхаіл Эпштэйн лічыць, што характарыстыкі эсэ збліжаюць яго з раманам, і ў сваёй працы «Парадоксы навізны» прыводзіць словы Юрыя Алешы: «Мне здаецца, што адзіны твор, які я магу напісаць як значны, патрэбны людзям, — кніга пра маё ўласнае жыццё. <…> Разважанне ці ўспамін на дваццаць або трыццаць радкоў, максімальна на сто... гэта і ёсць сучасны раман» [5]. Абодва жанры не толькі ўзніклі ў адзін час, а і сцвердзілі права сучаснага ўвайсці ў свет усталяваных каштоўнасцей і паказваць іх суадноснасць з індывідуальнасцю аўтара і героя. Твор напісаны сталым чалавекам, які, прыйшоўшы да асэнсавання сапраўднай глыбіні і значнасці жыццёвых з’яў, звяртаецца да чытача: «Потым зразумееш і ўпэўнішся, што паняцці *жытло* і *родная хата* ніяк не адназначныя, без яе іншы чалавек можа аказацца мала чаго варты, неўпрыкмет будзе губляць чуласць чалавечнасці, цэласнасць натуры. …Зусім выпадкова стрэлася ў Пімена Панчанкі, з асабістых дзённікавых нататак: “Атрымаць кватэру — адно, а пабудаваць хату — зусім іншае”. Няма яе — і ўвечары сціплы сусед не адчыніць брамкі, не пройдзе стамлёным крокам да старой лавачкі — прысесці, перакурыць, памаўчаць…» [1, с. 86].

Адступленне ад прамога аповеду азначае, што пры парушэнні быцця нейкай падзеяй, справай, мэтай у ім усё ж захоўваецца «непарушная раўнавага, супакаенне, гармонія...» [2, с. 92].

Апавяданне пачынаецца аўтарскім разважаннем: «“Ты куды? — Дахаты. А ты адкуль? — З хаты…” У такім, максімальна спрошчаным, дыялогу ці і не выкладзены ўвесь сэнс так неабходнага кожнаму з нас, жывых, таго рэальнага прытулку на зямлі, у жыцці штодзённым? А шмат каму (мо, менавіта, табе…) нават ці не з містычным адценнем — *родная хата*» [1, с. 50].

Венанцы Вікенцевіч нарадзіўся ў 1936 годзе ў горадзе Баранавічы. Таму зразумела, што ў апавяданні аўтар звяртаецца да дзіцячых успамінаў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Так выглядала хата, «…дзе прыйшлося першы раз падаць галасок…» [1, с. 51]: «Хата бабіна нічым не вылучаецца сярод іншых: белая пад цёмнай саламянай страхой, сінія з белым аканічкі, каваная клямка цяжкіх, амаль квадратных, дзвярэй, у абодва бакі ад якіх усыпаная кастрыцаю прызба, ля ўваходу плоскі камень адной прыступкай» [1, с. 52].

Але хата для Венанцы Бутрыма — не проста хата, не набор будаўнічых матэрыялаў, а духоўная каштоўнасць: «…укрыць ад непагадзі такое адчувальнае цела, адагрэцца ў сцюжу… можна ж і пера-начаваць, і пажыць і ў невыпадковым становішчы, а то і з камфортам… Не, выразна адчуць, што гэта менавіта *твой* прытулак, тыя сцены, што вядома, дапамагаюць, бо родныя; тыя, што без цябе, тваёй прысутнасці з цягам часу ператворацца ў стандартны набор бёрнаў, ліштваў, дранкі, цвікоў ці халодных алюмінію і шкла, мёртвай цэглы» [1, с. 50].

Адно з балючых уражанняў дзяцінства — пажары. Але не менш уражвае і «ўпартае аднаўленне беззваротна страчанага». «Марудна, але расце, пашыраецца, бо маўкліва, упарта трымаюцца гэтага кавалачка сваёй зямлі, меншага за макавае зерне, мікраскапічнага на той агульнай, неабсяжнай, спавітай сеткаю мерыдыянаў і паралеляў» [1, с. 78].

**Заключэнне.** Мастацкі твор нельга разглядаць без уліку асобы яго стваральніка. Адзін з тэрмінаў, які пазначае прысутнасць аўтара ў тэксце, — аўтарская свядомасць. Яна часта рэалізуецца ў форме эсэізаваных лірычных адступленняў, што і назіраецца ў апавяданні В. Бутрыма. Іх характарызуе нязмушанасць, часта парадаксальнасць выкладу і сцвярджэнне ў сучасным свеце традыцыйных каштоўнасцей. Адной з іх заўсёды застаецца чалавечае жытло, хата, што асэнсоўваецца пісьменнікам не толькі як матэрыяльны аб’ект, а і духоўная прастора.

**Спіс цытуемых крыніц**

1. *Бутрым, В.* Маўклівыя сумныя птушкі : эсэ, апавяданні, аповесці / В. Бутрым. — Смоленск : Смоленск-Пресс, 2011. — 354 с.
2. *Гачев, Г. Д.* Содержательность художественных форм. Эпос. Лирика. Театр / Г. Д. Гачев. — М. : Изд-во Моск. ун-та : Флинта, 2008. — 288 с.
3. *Мельничук, О. А.* Повествование от первого лица. Интерпретация текста / О. А. Мельничук. — М. : МГУ, 2002. — 208 с.
4. Эссе это [Электронный ресурс] // Словари и энциклопедии на Академике. — Режим доступа: http://dic.academic.ru/dic.nsf/enc3p/338226/127966 . — Дата доступа: 01.11.2016.
5. *Эпштейн, М.* Парадоксы новизны. О литературном развитии XIX—XX веков [Электронный ресурс] / М. Эпштейн. — М., 1988. — Режим доступа: http://www.booksite.ru/localtxt/epsh/tein/epshtein_m/parad_nov/ . — Дата доступа: 01.11.2016.

Репозиторий БарГУ